**Спіс выкарастаных крыніц**

1. Асіноўскі С. Там, дзе цвіце фіялка дамейкіяна / С. Асіноўскі // Архівы і справаводства. – 2010.– N 6. – С. 142–151.

2. Беларускае замежжа. Белорусское зарубежье. Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. – Мінск, 2010.

3. Мяснікоў А. Незапатрабаваны Бацькаўшчынай беларус / А. Мяснікоў // Полымя. – 2010 – N 7. – С. 166–172.

4. Мазоўка Н. Дамейка Ігнат Іпалітавіч / Н. Мазоўка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 202–203.

УДК 94 (476)

# ЖАНЧЫНЫ Ў ГІСТОРЫІ: АЛЕНА ГЛІНСКАЯ

*Студэнт – Пракаповіч Д.У., 19 рпт, 1 курс ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя:** «У артыкуле разглядаецца жыццёвы шлях вялікай маскоўскай княгіні Алены Глінскай і яе роля ў гісторыі».

**Ключавыя словы:** грашовая рэформа, жанчына, праўленне, пераварот, рэфарматар, цэнтралізацыя ўлады.

На працягу шматвяковай гісторыі многія жанчыны пакінулі сваімі справамі значны, непаўторны след на зямлі. У кожнай з іх было рознае жыццё. Адны з іх нарадзіліся і дзейнічалі на беларускай зямлі, другія паволі лёсу трапілі ў іншыя краіны і праславіліся там.

Папярэднія эпохі падарылі гісторыі нямала выдатных жаночых імёнаў. Сярод іх – Алена Глінская. Яна была дачкой князя Васіля Львовіча з літоўскага роду Глінскіх і яго жонкі Ганны Якшыч, якая паходзіла з сербскага роду.

Глінскія, вядомыя па дакументах з 1437 года, лічылі, што паходзяць ад татарскага цемніка Мамая, унукі якога нібыта атрымалі ў надзел гарадок Глінск. Дзядзька Алены, князь Міхаіл Львовіч, быў буйным дзяржаўным дзеячам вялікага княства Літоўскага. Пасля паражэння бунту Глінскі апынуўся з сям’ёй у Маскве. Сярод бежанцаў была і юная Алена.

У 1526 годзе Алена Глінская была абраная нявестай вялікага князя Васіля ІІІ, які развёўся з першай жонкай з прычыны адсутнасці ў яе дзяцей. Алена нарадзіла Васілю дваіх сыноў – Івана і Юрыя.

Пасля смерці свайго мужа ў снежні 1533 года Алена Васільеўна фактычна здзейсніла пераварот, адхіліўшы ад улады назначаных апошняй воляй яе мужа семярых рэгентаў, у тым ліку роднага брата мужа і свайго

дзядзьку, і зрабілася кіраўніком Вялікага Княства Маскоўскага. Такім чынам, яна стала першай пасля вялікай княгіні Вольгі правіцельніцай адзінай рускай дзяржавы.

Яна не карысталася сімпатыямі баяр, як жанчына не маскоўскіх, а еўрапейскіх нораваў і выхавання. Бліжэйшым саюзнікам Алены быў яе жанаты фаварыт, князь Целяпнёў-Аўчына-Абаленскі. Гэтая сувязь выклікала незадавальненне ў баяраў. За выраз гэтых настрояў князь Міхаіл Глінскі быў пасаджаны пляменніцай ў турму.

Урад вялікай кнігіні праводзіў палітыку цэнтралізацыі дзяржавы. У гады яе праўлення рускае войска атрымала шэраг бліскучых перамог, у тым ліку ў час руска-літоўскай вайны 1534–1537 гадоў. У 1536 годзе дабілася ад польскага караля Жыгімонта І выгаднага для Расіі міра. Швецыю абавязала не дапамагаць Лівонскаму ордэну і Вялікаму Княству Літоўскаму.

Найбольш важным момантам у праўленні Алены Глінскай з'яўляецца правядзенне грашовай рэформы (пачата ў 1535 годзе). Яна фактычна ўвяла ў Маскоўскім княстве адзіную валюту. Гэта была срэбраная манета.

Памерла Глінская ў 1538 годзе. Існуе версія аб яе атручанні Шуйскімі, што пацвярджаецца апошнімі даследаваннямі. Але факт атручвання да гэтага часу не прызнаны гісторыкамі як бясспрэчны і не выклікаючы сумненняў. Яна пахаваная ў Вазнясенскім жаночым манастыры ў маскоўскім Крамлі.

Алена Глінская назаўсёды засталася вялікай рэфарматаркай у гісторыі Расіі, але і па сённяшні дзень на яе Радзіме няма ні помніка, ні нават вуліцы, якія б былі названыя ў гонар гэтай знакамітай жанчыны.

**Спіс выкарастаных крыніц**

1. Шикман А.П. Деятели отечественной истории. Биографический справочник. – Москва, 1997.

2. Вольдемар Балязин. Занимательная история России. – Москва, 2001.

УДК 001. 894: 62

## РУДОЛЬФ ДИЗЕЛЬ: «ИНЖЕНЕР МОЖЕТ ВСЁ»

*Студент – Атымурадов М.Д., 24 мо, 1 курс, ФТС*
*Научный руководитель – Гринцевич Т.И., к.фил.н., доцент*
*УО «Белорусский государственный аграрный технический университет», г. Минск, Республика Беларусь*

**Аннотация.** Статья посвящена великому немецкому изобретателю Рудольфу Дизелю, человеку, который создал двигатель, завоевавший весь мир.